Весці БДПУ. Серыя 1. 2023. № 4. С. 105–108

УДК 81:008+39(=161.3)

# КРЫТЭРЫІ ВЫЛУЧЭННЯ КЛЮЧАВЫХ КАНЦЭПТАЎ ПРЫ МАДЭЛЯВАННІ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КАНЦЭПТАСФЕР

**К. С. Півавар,**
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дактарант кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*

Паступіў у рэдакцыю 10.10.2023.

UDC 81:008+39(=161.3)

# CRITERIA FOR SELECTING KEY CONCEPTS IN THE MODELING OF NATIONAL CONCEPTSPHERES

**K. Pivavar,**
*doctoral student of the department of linguistics and linguodidactics, candidate of Philological Sciences Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*

Received on 10.10.2023.

У артыкуле прапанаваны крытэрыі вылучэння ключавых канцэптаў: увага да слова-імені канцэпту (высокая частотнасць, актыўная словаўтваральная аснова, «этымалагічная памяць»); наяўнасць вялікай колькасці слоў, якія актуалізуюць сэнсы ключавога канцэпту, або разгалінаванае намінатыўнае поле канцэпту; улік структурных асаблівасцей канцэпту – абавязковая наяўнасць ярка выражанага каштоўнаснага і вобразнага кампанентаў; ужыванне слоў-рэпрэзентантаў канцэпту ў прэцэдэнтных тэкстах, выкарыстанне ў складзе фразеалагізмаў, літаратурных і фальклорных афарызмаў, паўтор у тэматыцы тэкстаў розных тыпаў дыскурсу; аналіз філалагічных даследаванняў; зварот да напрацовак іншых гуманітарных навук; цесная сувязь канцэпту з іншымі ключавымі канцэптамі. Аўтар прапануе спіс ключавых канцэптаў беларускай моўнай карціны свету. Дадзеная сістэма крытэрыяў можа прымяняцца для мадэлявання канцэптасфер іншых лінгвакультур.

*Ключавыя словы*: ключавы канцэпт; канцэптасфера; моўная карціна свету беларусаў.

The article proposes criteria for selecting key concepts: attention to the word-name of the concept (high frequency, active word-forming base, «etymological memory»); the presence of a large number of words that actualize the meanings of the key concept, or a branched nominative field of the concept; taking into account the structural features of the concept – the mandatory presence of pronounced value and image components; the use of words representative of the concept in precedent texts, the use of phraseological units, literary and folkloric aphorisms, repetition in the subject matter of texts of various types of discourse; analysis of philological studies; reference to developments in other humanitarian sciences; the close relationship of the concept to other key concepts. The author proposed a list of key concepts of the Belarusian language picture of the world. The proposed system of criteria can be applied to model the concept spheres of other linguistic cultures.

*Keywords:* key concept; conceptual sphere; language picture of the world of Belarusians.

*Уводзіны*. У антрапалагічна арыентаваных кірунках лінгвістыкі існуе вялікая колькасць азначэнняў канцэпту, абагульняючы якія можна выдзеліць асноўныя яго прыкметы: ментальную прыроду, магчымасць акумуляваць веды этнасу пра навакольную рэчаіснасць, а таксама знаходзіць выражэнне у мове. Такім чынам, канцэпт уяўляе сабой ментальную рэпрэзентацыю ведаў чалавека пра рэчаіснасць. Лінгвакультура вызначаецца намі як культура, увасобленая і замацаваная ў знаках мовы; у яе змест уключаюцца вобразы, сімвалы, стэрэатыпы, прэцэдэнтныя тэксты і імёны, каштоўнасці, традыцыі, моўныя сродкі і сімвалы.

Вывучэнне ключавых канцэптаў – сродак пранікнення ў ментальнасць народа, разумення культурных асаблівасцей, норм і правіл паводзін у пэўным грамадстве. У ключавых канцэптах увасоблены найважнейшыя базавыя каштоўнасці нацыянальна-культурных супольнасцей. Абранае тэрміналагічнае абазначэнне пабудавана на метафары («ключы» да культуры) і актыўна ўжываецца многімі даследчыкамі (А. Вяжбіцкая, У. І. Карасік, В. А. Маслава, М. У. Піменава і інш.).

Мэта артыкула – прапанаваць крытэрыі вылучэння ключавых канцэптаў дзеля мадэлявання нацыянальнай канцэптасферы. Для дасягнення дадзенай мэты неабходна вырашыць наступныя задачы: 1) прааналізаваць лінгвістычныя працы, прысвечаныя вылучэнню ключавых канцэптаў і апісанню канцэптасфер; 2) прапанаваць сістэму крытэрыяў вылучэння ключавых канцэптаў і апісання канцэптасферы на беларускамоўным матэрыяле. Тэарэтычнай базай паслужылі напрацоўкі ў галіне лінгвакультуралогіі і кагнітыўнай лінгвістыкі расійскіх і беларускіх вучоных. Ілюстрацыйным матэрыялам паслужылі беларускамоўныя кантэксты. Практычная значнасць даследавання заключаецца ў магчымасці прымянення прапанавай сістэмы крытэрыяў да матэрыялу іншых моў.

*Асноўная частка.* Пытанне вылучэння ключавых канцэптаў суадносіцца з пытаннем класіфікацыі канцэптаў. Ёсць сумненне ў магчымасці выбудоўвання поўнай і несупярэчлівай класіфікацыі канцэптаў, што абумоўлена іх лабільнасцю, дыфузнасцю сэнсаў моўных адзінак, супярэчлівасцю свядомасці. Разам з тым, ёсць паспяховыя спробы класіфікацыі канцэптаў з пункту гледжання іх а) лінгвістычнага афармлення – лексічныя і фразеалагічныя канцэпты (А. П. Бабушкін), лексікалізаваныя і граматычныя канцэпты (А. Вяжбіцкая), б) прыналежнасці да дыскурсу як асяроддзя моўнага існавання (побытавыя, мастацкія і навуковыя (У. І. Карасік), в) актуальнасці для ўсіх нацый, асобна ўзятай нацыі, сацыяльных груп, для канкрэтнага чалавека (Д. С. Ліхачоў), г. зн. універсальныя, этнічныя, групавыя, індывідуальныя канцэпты.

Пры вылучэнні ключавых канцэптаў таксама трэба ўлічваць тыпалогію канцэптаў, заснаваную

на звароце да носьбітаў канцэпту. Да першай групы адносяцца фундаментальныя агульначалавечыя канцэпты, якія валодаюць экзістэнцыйнай значнасцю для чалавецтва, кожнага народа. Да такіх канцэптаў адносяць канцэпты *час, прастора, жыццё, чалавек, смерць*. Другую групу складаюць канцэпты, якія існуюць у большасці культур, але з'яўляюцца асабліва значнымі для канкрэтнай культуры. Напрыклад, канцэпты *родная мова* і *воля* ў моўнай карціне свету беларусаў актуальныя па прычыне доўгага шляху беларусаў да незалежнасці, права гаварыць на роднай мове. Да трэцяй групы адносяцца этнаспецыфічныя, унікальныя канцэпты дадзенай культуры. Цяжкасці перакладу лексічных рэпрэзентантаў такіх канцэптаў на іншыя мовы з'яўляецца, напэўна, асноўным крытэрыем іх вылучэння. Па нашым меркаванні, у беларускай лінгвакультуры могуць выступіць *талака, хата*, прэцэдэтныя імёны, якія сталі канцэптамі – *Ф. Скарына, Е. Полацкая, Якуб Колас, Янка Купала*. На нашу думку, пры мадэляванні нацыянальнай канцэптасферы неабходна абіраць ключавыя канцэпты з кожнай названай групы.

На сённяшні дзень пытанне методыкі выяўлення найбольш важных ключавых канцэптаў культуры таго ці іншага этнасу недастаткова распрацавана. Даволі часта даследчыкі абапіраюцца на ўласную інтуіцыю пры ўстанаўленні важнасці таго ці іншага канцэпту для пэўнай культуры. Сінанімічным да паняцця «ключавы канцэпт» з'яўляецца тэрмін «канстанта культуры» – канцэпт, які з'явіўся ў глыбокай старажытнасці і прасочваецца праз погляды сучасных носьбітаў мовы; «нейкі пастаянны прынцып культуры» (Ю. С. Сцяпанаў, С. Г. Праскурын [1, с. 9]). А. Вяжбіцкая заўважае, што не існуе аніякай аб'ектыўнай працэдуры, якая б дазволіла лагічным шляхам вызначыць набор ключавых канцэптаў культуры. У сувязі з гэтым яна прапаноўвае даследчыкам абапірацца на шэраг фактараў, у першую чаргу «культурную распрацаванасць», пад якой А. Вяжбіцкая разумее лексічную распрацаванасць якой-небудзь галіны, прадстаўленасць яе ў слоўніку [2, с. 28–30]. Другім індыкатарам ключавой ролі канцэпту з'яўляецца яго частае фігураванне ў паўсядзённым маўленні, а таксама (у якасці тэмы) у народнай і «высокай» літаратуры [2, с. 27–37].

Дж. Лакоф да ліку фундаментальных адносіць канцэпты, звязаныя з іншымі канцэптамі канцэптуальнай сістэмы і вызначае іх арганізацыю, напрыклад, канцэпты прасторы і часу. У сувязі з гэтым дадзеныя канцэпты звычайна становяцца часткай граматыкі мовы [3, с. 308].

Апісваючы ключавыя ідэі рускай моўнай карціны свету, Г. А. Залізняк, А. Д. Шмялёў, І. Б. Лявонціна фармулююць наступныя крытэрыі іх вылучэння: «тое, што пэўная ідэя з'яўляецца для дадзенай мовы ключавой, пацвярджаецца, з аднаго боку, тым, што гэтая ідэя паўтараецца ў значэнні іншых слоў і выразаў, а таксама часам сінтаксічных канструкцый і нават словаўтваральных мадэлей, а з другога боку, тым, што менавіта гэтыя словы горш за іншыя перакладаюцца на замежныя мовы» [4, с. 10].

На думку В. А. Маславай, да ключавых канцэптаў рускай культуры адносяцца такія абстрактныя імёны, як «Сумленне, Лёс, Воля, Доля, Грэх, Закон, Свабода, Інтэлігенцыя, Радзіма і пад.» [5, с. 137].

Пры апісанні базавых канцэптаў фразеалагічнай карціны свету беларусаў В. А. Ляшчынская прытрымліваецца шэрагу крытэрыяў, ці паводле У. І. Карасіка і Г. Г. Слышкіна «базавымі характарыстыкамі лінгвакультурных канцэптаў» выступаюць: комплекснасць існавання, ментальная прырода, каштоўнасць, умоўнасць і размытасць, зменлівасць, абмежаванасць свядомасцю носьбіта, трохкампанентнасць, метадалагічная адкрытасць [6, с. 28].

Такім чынам, ключавымі канцэптамі лінгвакультуры мы называем абумоўленыя ёй ядзерныя адзінкі карціны свету, якія валодаюць асаблівым значэннем як для асобнай моўнай асобы, так і для лінгвакультурнай супольнасці ў цэлым. Пры вызначэннм ключавога канцэпту намі ўлічваецца шэраг фактараў:

1. Увага да **слова-імені канцэпту**. На думку многіх даследчыкаў, слова-імя канцэпту павінна быць высокачастотным, мець актыўную словаўтваральную аснову, утрымліваць «этымалагічную памяць» [7, с. 11].
2. Наяўнасць вялікай колькасці слоў, якія актуалізуюць сэнсы ключавога канцэпту, або **разгалінаванае намінатыўнае поле канцэпту**. Маюцца на ўвазе не толькі дадзеныя частотных слоўнікаў (зразумела, што самымі частотнымі лексемамі будуць службовыя часціны мовы), але і паўтаральнасць асобных паняццяў у розных відах дыскурсу: мастацкі, публіцыстычны, навуковы (навукова-папулярны).
3. **Улік структурных асаблівасцей канцэпту – абавязковая наяўнасць ярка выражанага каштоўнаснага і вобразнага кампанентаў**. Мы прытрымліваемся меркавання, што чым важнейшы канцэпт у моўнай карціне свету народа, тым больш **разгалінаванае поле яго паняццевых складнікаў**, ярка выражаныя каштоўнасны і вобразны кампаненты. Важна таксама ўлічваць наяўнасць у ключавых словах своеасаблівых канцэптуальных значэнняў, звязаных з адлюстраваннем светаўспрымання і светапогляду народа. Напрыклад, пры апісанні канцэпту *шчасце* дадаткова неабходна тлумачыць адзін з рэпрэзентантаў вобразнага кампанента *папараць-кветка*, або *бацькоўская буслянка* як вобразны складнік канцэпту сям'я.
4. **Ужыванне слоў-рэпрэзентантаў канцэпту ў прэцэдэнтных тэкстах, выкарыстанне ў складзе фразеалагізмаў, літаратурных і фальклорных афарызмаў, паўтор у тэматыцы тэкстаў розных тыпаў дыскурсу** (хрэстаматыйная літаратура, навукова-папулярная літаратура), а таксама вывучэнне лексікаграфічных прац – частотных, асацыятыўных слоўнікаў, слоўнікаў парэмій і фразеалагізмаў.
5. **Аналіз філалагічных даследаванняў:**
   а) вывучэнне тэматыкі лінгвістычных *прац у лінгвакультуралагічным і лінгвакагнітыўным рэчышчы*. За дзесяцігоддзі актыўных пошукаў у галіне антрапацэнтрычна арыентаванай лінгвістыкі назапашана вялікая колькасць прац, у тым ліку лексікаграфічных, у якіх апісаны шэраг канцэптаў. Так, пры аналізе «Анталогіі канцэптаў» [8] мы прыйшлі да высновы, што найчасцей даслед-

чыкі звярталіся да такіх канцэптаў, як *свобода (воля), родной язык, человек, родина, любовь, время, пространство* ў рускай моўнай карціне свету;

б) зварот да *псіхалінгвістычных даследаванняў*. У расійскім мовазнаўстве ўжо зроблена ўдалая спроба рэканструкцыі ядра моўнай свядомасці. Так, Н. У. Уфімцава сцвярджае, што «у рускай моўнай свядомасці» найбольш важнымі рэаліямі з'яўляюцца: *дом, жыццё, сябра, грошы, радасць, зло, дзень, любоў, лёс, любоў, праца, стол, дарога, размова* [9]. Даследчыца прапанавала арыгінальную сістэму крытэрыяў рэканструкцыі моўнай свядомасці, дзе галоўным з'яўляецца аналіз асацыяўтыўных эксперыментаў, калі акцэнт робіцца на вывучэнне слоў-рэакцый апытаных, і прынцып частотнасці ўжывання той ці іншай моўнай адзінкі;

в) аналіз літаратуразнаўчых (пры мадэляванні канцэптасферы на матэрыяле мастацкага тэксту) і журналісцкіх даследаванняў. Так, пры мадэляванні беларускай канцэптасферы карыснымі для вывучэння адзначым працы Т. У. Падаляк «Аксіялогія сучаснай беларускай журналістыкі» [10], дзе адзначаны тэндэнцыі сучаснай журналістыкі да адлюстравання гістарычнай памяці ўвогуле і памяці пра Вялікую Айчынную вайну ў прыватнасці як каштоўнасныя арыенціры сучасных публіцыстаў. Сярод літаратуразнаўчых прац адзначым даследаванне А. М. Мельнікавай [11], у якім асэнсоўваюцца спецыфіка беларускага вобраза свету, маральна-этычныя каштоўнасці, філасофія жыцця, канцэпцыя чалавека, мадэль нацыянальнага быцця на матэрыяле беларускай літаратуры ХХ ст.

6. **Зварот да напрацовак іншых гуманітарных навук** – сацыялогіі, этнапсіхалогіі, этнаграфіі, філасофіі. Нашу ўвагу прыцягнулі сацыялагічныя даследаванні, прысвечаныя выяўленню каштоўнасных арыентацый, бо, як вядома, каштоўнасны кампанент – абавязковы складнік у структуры канцэптаў. Такія даследаванні сацыёлагі рэгулярна праводзяць і публікуюць. Мы звярнуліся да аналізу дадзеных апытання «Сацыякультурны партрэт сучаснага беларускага грамадства», праведзенага ў лістападзе 2020 г. на аснове 1500 рэспандэнтаў [12]. Найбольш важнымі для жыхароў Беларусі аказаліся «дамашнія» каштоўнасці, у цэнтры якіх знаходзіцца *чалавек* і яго *сям'я*. У першую пяцёрку адказаў рэспандэнтаў увайшоў наступны шэраг: здароўе, бацькі, душэўны спакой і камфорт, муж (жонка), любімы чалавек, дзеці. Другая ў іерархіі прыярытэтаў група звязана з дабрабытам і працоўнай дзейнасцю: матэрыяльна забяспечанае жыццё, прафесіяналізм, цікавая праца. На трэцім месцы аказалася сацыяльнасць (сябры, грамадская карысць працы, хобі), на чацвёртым – рэчы, звязаныя са статусам і ўладай. Як адзначае В. В. Старычонак, «Дадзены каштоўнасны шэраг добра суадносіцца з вынікамі, атрыманымі ЦСПД БДУ в 2018 г. Такім чынам, архетып беларуса – гаспадар ці гаспадыня свайго дома, якія зберагаюць сваю асабістую прастору» [12, с. 95].

Сярод іншых напрамкаў гуманітарнай навукі, працы ў галіне якіх неабходна вывучыць пры вылучэнні ключавых канцэптаў – гэта этналогія, этнапсіхалогія. Так, пры мадэляванні беларускай нацыянальнай канцэптасферы мы абапіраліся на працы В. В. Кірыенкі [13], А. П. Мельнікава [14]. Адбор ключавых канцэптаў варта праводзіць шляхам мэтанакіраванага аналізу філасофскіх прац. Напрыклад, у працы віцебскага даследчыка А. Б. Дзямідава «Феномены человеческого бытия» [15] апісаны такія феномены быцця, як *гульня, адзінота, камунікацыя, смерць, любоў (каханне).* Безумоўна, названыя з'явы могуць выступаць імёнамі ключавых канцэптаў.

Мы лічым абавязковым зварот да аксіялогіі – філасофскага вучэння аб прыродзе сацыяльна-эстэтычных каштоўнасцей жыцця і культуры, а таксама агульная тэорыя каштоўнасцей, таму што, як адзначалася вышэй, каштоўнасны кампанент – абавязковы, ядзерны кампанент ключавога канцэпту.

7. **Сувязь ключавога канцэпту з іншымі.** Дадзены крытэрый вынесены намі апошнім па той прычыне, што сувязі канцэпту з іншымі лінгваментальнымі ўтварэннямі выяўляюцца на этапе яго рэканструкцыі на тым ці іншым моўным матэрыяле. Так, пачынаючы наша даследаванне з вывучэння канцэптаў, ключавы характар якіх не выклікае сумнення ў кожнай лінгвакультуры (*радзіма, сям'я, воля, мова*), мы назапасілі значную колькасць кантэкстаў, якія ілюструюць іх сувязь з канцэптамі *памяць, дабрабыт, асвета*, а таму складзены намі першапачатковы спіс ключавых канцэптаў прыйшлося карэкціраваць з улікам выяўленага моўнага матэрыялу.

*Заключэнне.* Такім чынам, ключавымі канцэптамі становяцца толькі тыя з'явы рэчаіснасці і мысленчай дзейнасці, якія актуальныя і каштоўныя для дадзенай культуры, маюць вялікую колькасць моўных адзінак (лексем, кантэкстаў) для сваёй фіксацыі, з'яўляюцца тэмай прэцэдэнтных тэкстаў. У дадзеным артыкуле намі прапанавана сістэма крытэрыяў для вылучэння ключавых канцэптаў і мадэлявання з іх нацыянальнай канцэптасферы. Пры прымяненні дадзеных крытэрыяў і пошуку кантэкстаў, якія ілюструюць узаемасувязь дадзеных канцэптаў, мы прапануем беларускую нацыянальную канцэптасферу з наступных лінгваментальных утварэнняў: *чалавек, жыццё, Бог, лёс, здароўе, смерць, час, прастора, агонь, вада, зямля, паветра (вецер), колер, лік, каханне, шчасце, сяброўства, памяць, вера, Радзіма, народ, воля, мова, сям'я, праца, асвета, вайна, бяспека, мір, праўда, перамога, поспех, прыгажосць, справядлівасць, памяркоўнасць, гасціннасць, дабрыня (дабро), хата (дом), дабрабыт, гасціннасць, спадчына, бацька, зубр, бусел, хлеб, соль, дрэва, вёска, горад, дарога, лес, кніга, Біблія, Ф. Скарына, Е. Полацкая, Янка Купала, Якуб Колас, Хатынь* і г. д. У лік іх уключаны як універсальныя (быційныя), так і культурна абумоўленыя. Апісанне канцэптасферы прадугледжвае абагульненне ўсіх кантэкстаў, у якіх ужываюцца ключавыя словыносьбіты канцэптуальнага сэнсу, з мэтай выяўлення характэрных уласцівасцей канцэпту. Таксама неабходна з дапамогай ілюстрацыі моўных кантэкстаў праілюстраваць сувязь паміж канцэптамі, у гэтым выпадку можна казаць пра мадэляванне пэўнай канцэптасферы.

## Літаратура

1. *Степанов, Ю. С.* Константы мировой культуры. Алфавиты и алфавитные тексты в периоды двоеверия / Ю. С. Степанов, С. Г. Проскурин. – М. : Наука, 2004. – 368 с.
2. *Вежбицкая, А.* Понимание культур через посредство ключевых слов / А. Вежбицкая. – М. : Языки славянской культуры, 2001. – 287 с.
3. *Лакофф, Дж.* Женщины, огонь и опасные вещи. Что категории языка говорят нам о мышлении / Дж. Лакофф. – М. : Языки славянской культуры, 2004. – 792 с.
4. *Зализняк, А. А.* Ключевые идеи русской языковой картины мира / А. А. Зализняк, И. Б. Левонтина, А. Д. Шмелев. – М. : Языки славянской культуры, 2005. – 525 с.
5. *Маслова, В. А.* Лингвокультурология : учеб. пособие / В. А. Маслова. – М. : Academia, 2001. – 208 с.
6. *Ляшчынская, В. А.* Базавыя канцэпты фразеалагічнай карціны свету беларусаў / В. А. Ляшчынская. – Мінск : РІВШ, 2015. – 224 с.
7. *Ипанова, О. А.* Концепт "жизнь" в русской языковой картине мира: Лингвокультурологический и лексикографический аспекты : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.01 / О. А. Ипанова ; СПбГУ. – СПб., 2005. – 28 с.
8. Антология концептов / под ред. В. И. Карасика, И. А. Стернина. Том 1–8. – Волгоград : Парадигма, 2005–2011.
9. *Уфимцева, Н. В.* Русские: опыт еще одного самопознания / Н. В. Уфимцева // Этнокультурные проблемы языкового сознания. Сборник статей / Отв. ред., Н. В. Уфимцева; Ияз РАН. – Москва, 1996. – С. 139–162.
10. *Падаляк, Т. У.* Аксіялогія сучаснай беларускай журналістыкі / Т. У. Падаляк ; навук. рэд. У.В. Гніламѐдаў. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2016. – 263 с.
11. *Мельнікава, А. М.* Нацыянальна-светапоглядныя каардынаты беларускай літаратуры першай трэці ХХ стагоддзя / А. М. Мельнікава. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2016. – 214 с.
12. *Стариченок, В.* Ценности белорусов в разрезе социологии / В. Стариченок // Беларуская думка. – 2021. – № 4. – С. 89–95.
13. *Кириенко, В. В.* Белорусская ментальность : истоки, современность, перспективы / В. В. Кириенко. – Гомель : Гомел. гос. тех. ун-т, 2009. – 319 с.
14. *Мельников, А. П.* Национальный менталитет белорусов / А. П. Мельников. – 2-е изд. – Минск : Право и экономика, 2005. – 112 с.
15. *Демидов, А. Б.* Феномены человеческого бытия / А. Б. Демидов. – Минск : ЗАО Издательский центр «Экономпресс», 1999. – 180 с.

## References

1. *Stepanov, Yu. S.* Konstanty mirovoj kul'tury. Alfavity i alfavitnye teksty v periody dvoeveriya / Yu. S. Stepanov, S. G. Proskurin. – M. : Nauka, 2004. – 368 s.
2. *Vezhbickaya, A.* Ponimanie kul'tur cherez posredstvo klyuchevyh slov / A. Vezhbickaya. – M. : Yazyki slavyanskoj kul'tury, 2001. – 287 s.
3. *Lakoff, Dzh.* Zhenshchiny, ogon' i opasnye veshchi. Chto kategorii yazyka govoryat nam o myshlenii / Dzh. Lakoff. – M. : Yazyki slavyanskoj kul'tury, 2004. – 792 s.
4. *Zaliznyak, A. A.* Klyuchevye idei russkoj yazykovoj kartiny mira / A. A. Zaliznyak, I. B. Levontina, A. D. Shmelev. – M. : Yazyki slavyanskoj kul'tury, 2005. – 525 s.
5. *Maslova, V. A.* Lingvokul'turologiya : ucheb. posobie / V. A. Maslova. – M. : Academia, 2001. – 208 s.
6. *Lyashchynskaya, V. A.* Bazavyya kancepty frazealagichnaj karciny svetu belarusaў / V. A. Lyashchynskaya. – Minsk : RIVSh, 2015. – 224 s.
7. *Ipanova, O. A.* Koncept "zhizn'" v russkoj yazykovoj kartine mira: Lingvokul'turologicheskij i leksikograficheskij aspekty : avtoref. dis. ... kand. filol. nauk : 10.02.01 / O. A. Ipanova ; SPbGU. – SPb., 2005. – 28 s.
8. Antologiya konceptov / pod red. V. I. Karasika, I. A. Sternina. Tom 1–8. – Volgograd : Paradigma, 2005–2011.
9. *Ufimceva, N. V.* Russkie: opyt eshche odnogo samopoznaniya / N. V. Ufimceva // Etnokul'turnye problemy yazykovogo soznaniya. Sbornik statej / Otv. red., N. V. Ufimceva; Iyaz RAN. – Moskva, 1996. – S. 139–162.
10. *Padalyak, T. U.* Aksiyalogiya suchasnaj belaruskaj zhurnalistyki / T. U. Padalyak ; navuk. red. U.V. Gnilamѐdaў. – Minsk : Belarus. dzyarzh. un-t, 2016. – 263 s.
11. *Mel'nikava, A. M.* Nacyyanal'na-svetapoglyadnyya kaardynaty belaruskaj litaratury pershaj treci HH stagoddzya / A. M. Mel'nikava. – Gomel' : GDU imya F. Skaryny, 2016. – 214 s.
12. *Starichenok, V.* Cennosti belorusov v razreze sociologii / V. Starichenok // Belaruskaya dumka. – 2021. – № 4. – S. 89–95.
13. *Kirienko, V. V.* Belorusskaya mental'nost' : istoki, sovremennost', perspektivy / V. V. Kirienko. – Gomel' : Gomel. gos. tekh. un-t, 2009. – 319 s.
14. *Mel'nikov, A. P.* Nacional'nyj mentalitet belorusov / A. P. Mel'nikov. – 2-e izd. – Minsk : Pravo i ekonomika, 2005. – 112 s.
15. *Demidov, A. B.* Fenomeny chelovecheskogo bytiya / A. B. Demidov. – Minsk : ZAO Izdatel'skij centr «Ekonompress», 1999. – 180 s.